3. Синельникова, О.В. Музыкальная форма : учебно-метод. комплекс / О.В. Синельникова. – Кемерово : КемГУКИ, 2014.

4. Цукер, А. У истоков рок-оперы / А. Цукер // Музыка и ты : Альманах для школьников. – М. : Советский композитор, 1990. – Вып. 9.

**Жарская Л.А.,** студ. 408 гр.
Навуковы кіраўнік – Глякаў П.У.

## БЕЛАРУСКАМОЎНЫЯ МЕДЫЯРЭСУРСЫ Ў ТЭЛЕКАМУНІКАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ

У сувязі са з'яўленнем у Беларусі новых разнастайных моладзевых мерапрыемстваў, прысвечаных беларускай мове і культуры: фестываляў (музычны фестываль ―Камяніца”, Дзень беларускай мовы, Дзень вышыванкі, фестываль беларускамоўнай рэкламы ―Ad.nak”, спартовы фестываль ―Мова Cup”), праектаў і акцый (моўныя курсы Мова ―Нанова”, ―Мова ці Кава”, акцыя ―беларуская стужка”), а таксама росту попыту на камерцыйную прадукцыю з нацыянальным каларытам (―вышымайкі”, паўсядзённае адзенне з арнаментамі), можна сцвярджаць пра рост цікавасці да беларускай культуры і мовы сярод моладзі. Так як мова ў культуры займае асаблівае месца, варта надаць увагу папулярнасці некамерцыйных праектаў моўных курсаў, якія праходзяць ў Мінску і іншых гарадах Беларусі [2].

Акрамя культурных і адукацыйных праектаў варта ўзгадаць камерцыйныя арганізацыі і ІП, якія пачалі выкарыстоўваць у сваёй дзейнасці беларускую мову як арыгінальнае камерцыйнае рашэнне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(аўтамабільная кампанія ТАБАС, сетка заправак А-100, сетка гіпермаркетаў MartInn).

Гэта паказвае актуальнасць дадзенага пытання ў Беларусі як у сацыяльна-культурным асяроддзі, так і ў медыясферы.

Беларуская мова прысутнічае ў тэлекамунікацыйнай прасторы і займае сваю асаблівую нішу.

Беларускі філосаф Валянцін Акудовіч лічыць, што назіраецца з'ява, калі беларуская мова сыходзіць у віртуальную прастору і набывае там іншыя праявы жыцця: ―Беларусь як цэлае, з усёй культурай, мысьленьнем і, калі заўгодна, геаграфіяй перасоўваецца ў віртуальную прастору. І я ў гэтай сытуацыі бачу пэўныя плюсы, бо ў такой ―краіне" могуць жыць усе беларусы, раскіданыя па зямной кулі. Справа ў тым, што многія людзі саромеюцца ці не рызыкуюць размаўляць па-беларуску на вуліцы, у грамадзкіх установах, дзе працуюць. І таму мовы як быццам амаль не чуваць (не лічачы пэўныя супольнасьці, якія яе ўжываюць унутры), але адбываецца ―кампэнсацыя" праз пашырэньне беларускай мовы ў віртуальнай прасторы. Тут кожнага, хто гатовы ёй карыстацца (нават калі не надта добра ёю валодае), ніштo не стрымлівае. І, такім чынам, рэпрэсаваная ў рэальным жыцьці мова мае магчымасьць там разгарнуцца напоўніцу. Шэраг яшчэ можна дадатных момантаў далучыць сюды, каб зразумець, з чаго гэты фэномэн адбываецца" [5].

У Інтэрнэт прысутнічаюць 4 % сусветных моў, астатнія 96% лічацца для віртуальная прасторы мёртвымі. Беларуская мова лічыцца адной з актыўных у медыяпрасторы моў. На асаблівым месцы знаходзяцца дзве беларускамоўныя (тарашкевіца і наркамаўка) версіі энцыклапедыі Вікіпедыя. Класічны правапіс займае 58 месца па колькасьці артыкулаў, а афіцыйны – 67. Аднак, негледзячы на гэта, нельга аднесці беларускую мову да распаўсюджаных у віртуальным асяродку [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Большасьць электронных рэсурсаў прасторы байнэту на рускай мове. Цалкам беларускамоўныя сайты маюць, у асноўным, культурніцкую тэматыку. Тут на першым месцы можна паставіць сайт Таварыства Беларускай мовы імя Францыска Скарыны [7]. Беларускую версію сайту маюць некаторыя дзяржаўныя ўстановы, што цалкам адлюстроўвае агульную сітуацыю: існуе менш цалкам беларускамоўных рэсурсаў, шмат якія маюць проста беларускую версію.

Для збору ўсіх беларускамоўных рэсурсаў быў створаны праект mova.na.by, які мае ў сабе каталог сайтаў па рубрыках “Грамадства”, “Адукацыя”, “Культура”, “Персаналіі”, “СМІ”, “Праграмы і каталогі”, “Беларускія ўстановы”, “Артыкулы і кнігі” [6].

Пасля правядзення аналізу рэсурсаў былі атрыманыя наступныя вынікі:

– большасьць Інтэрнэт-рэсурсаў на беларускай мове маюць культурны ці тэматычны накірунак;

– цалкам беларускамоўныя рэсурсы маюць, у асноўным, недзяржаўныя арганізацыі ці праекты;

– назіраецца недахоп якасных інфармацыйных, моладзевых (глянцавыя, моладзевыя часопісы), некамерцыйных культурных праектаў.

Негледзячы на рост попыту да беларускай культуры, а ў асаблівасці, да накірункаў беларускага адзення і арнаментаў, рэсурсы па дадзенай тэматыцы паказаныя ў беларускай Інтэрнэт-прасторы вельмі слаба.

Аналіз рэсурсаў паказаў, што Інтэрнэт-крамаў, якія прапануюць адзенне з беларускім арнаментам ці болей аўтэнтычныя вырабы, вельмі мала ў беларускім Інтэрнэт-сегменце, а інфармацыйныя сайты ці парталы, прысвечаныя беларускаму строю ці арнаменту, адсутнічаюць увогуле.

У выніку чаго, прапануецца інфармацыйны праект на беларускай мове “Этнагорад”, прысвечаны народным строям і развіццю этна-культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў Беларусі, які павінен служыць як сваеасаблівай электроннай папулярнай энцыклапедыяй па тэматыцы беларускага строю, так і інфармацыйна-навіновым рэсурсам, у якім будуць асвятляцца тэматычныя падзеі і публікавацца інфармацыя нацыянальна-культурнай тэматыкі.

Мэта распрацоўкі праекту – стварэнне сучаснага рэсурсу на беларускай мове з прывабным і функцыянальным дызайнам, вялікай колькасцю фотаматэрыялаў, навінамі пра фолк-падзеі ў Беларусі.

Падобныя рэсурсы пакуль адсутнічаюць у байнэце і праект «Этнагорад» мог бы закрыць гэтую нішу і спрыяць папулярызацыі беларускай традыцыйнай культуры, што з'яўляецца важным і актуальным на сённяшні дзень.

---

1. 96 % языков для Интернета мертвы. Белорусский жив [Электронны рэсурс] // IT.TUT.by [http://42.tut.by/].– 2007. – Рэжым доступу : http://42.tut.by/378074. – Дата доступу : 30.03.2015.

2. Арт-Сядзіба [Электронны рэсурс] / Арт-Сядзіба. – Мінск, 2015. – Рэжым доступу: http://artsiadziba.by/. – Дата доступу: 30.03.2015.

3. Вікіпедыя. Свабодная энцыклапедыя [Электронны рэсурс] / Mova.na.by. – Мінск, 2015. – Рэжым доступу : https://be.wikipedia.org/. – Дата доступу : 30.03.2015.

4. Вікіпедыя. Вольная энцыкляпэдыя [Электронны рэсурс] / Mova.na.by. – Мінск, 2015. – Рэжым доступу : https://be-x-old.wikipedia.org/. – Дата доступу : 30.03.2015.

5. Карней, І. Беларуская мова ў інтэрнэце: віртуальная Беларусь ці рэзэрвацыя? / І. Карней // Радыё Свабода [http://www.svaboda.org/]. – 2007. – Рэжым доступу : http://www.svaboda.org/content/article/764014.html. – Дата доступу : 30.03.2015.

6. Mova.na.by [Электронны рэсурс] / Mova.na.by. – Мінск, 2015. –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэжым доступу : http://mova.na.by/. – Дата доступу : 30.03.2015.

7. Таварыства Беларускай Мовы [Электронны рэсурс] / Таварыства Беларускай Мовы. – Мінск, 2015. – Рэжым доступу : http://tbm-mova.by/. – Дата доступу : 30.03.2015.

**Ждан Н.А.,** студэнтка 119 гр.
Навуковы кіраўнік – Войцік С.Ф.

РЕПОЗИТОРИИ БГУКИ

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ МЕТАДЫЧНАЙ РАБОТЫ З ДЗЕЦЬМІ МАЛОДШАГА ШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ Ў АМАТАРСКІМ ФАЛЬКЛОРНЫМ АНСАМБЛІ

У сучаснай сістэме выхавання малодшы школьны ўзрост ахоплівае перыяд жыцця дзіцяці з сямі да дзесяці-адзінаццаці гадоў (І–ІІІ класы школы).

У гэты час у выхаванні маладога пакалення этнаграфія і фальклор павінны займаць вядучае месца. Засваенне ведаў, уменняў і навыкаў малодшага школьніка адбываецца пры занятку рознымі відамі мастацтва: літаратура, жывапіс, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, музыка, танец і г.д.

Агмені этнаграфічнай і фальклорнай культуры ў агульнаадукацыйнай школе захаваліся толькі дзякуючы энтузіязму і адданасці сваёй справе выкладчыкаў і кіраўнікоў устаноў культуры. Гэтая справа захоўваецца дзякуючы ўвядзенню факультатыўных заняткаў у школах, або працы гурткоў у палацах, дамах і цэнтрах творчасці, дзе ў аснову пакладзена вывучэнне сцэнічнага, музычнага і паэтычнага фальклору. Далучэнне дзяцей да беларускай народнай культуры адбы-